


# Абрам Багданаў

**Славуты амерыканскі мастак-монументаліст, жывапісец, дызайнер і настаўнік нарадзіўся ў Менску ў верасні 1888-га.**
Першыя 12 гадоў жыцця прайшлі ў Беларусі, тут ён пачаў маляваць і вучыцца, а дзіцячыя ўражанні засталіся з ім на ўсё далейшае жыццё. У снежні 1900-га, калі Абраму было ўжо 12 гадоў, сям'я перабралася за акіян, у Нью-Ёрк. Вучыўся ў школе Купэр-Юньён, Лізе студэнтаў-мастакоў, Нацыянальнай акадэміі дызайну ды Архітэктурнай школе пры Калумбійскім універсітэце.

У гады навучання Багданаў маляваў рэкламу для нью-ёркскіх часопісаў. У 1909–1911-ыя атрымліваў прызы за карціны на выставах у Нацыянальнай акадэміі. У 1912-м Абрам Багданаў атрымаў заказ на роспіс у будынку Габрэйскага таварыства прытулку і апекі ў Плізантвіле, што ў штаце Нью-Ёрк. Пазней Абрамаў напісаў фрэскі для будынку Архітэктурнае лігі і шэрагу сярэдніх навучальных установаў Нью-Ёрку. У 1915-м упершыню наведаў штат Мэн, пабываўшы на Атлантычным узбярэжжы ды выспах. У 1918-м пабываў на востраве Мангіґэн, дзе праз два гады набыў сабе дом.

У далейшым штогод прыязджаў сюды, каб пісаць марскія краявіды. Любіў выяўляць акіянскія штормы і навальніцы. У жывапісным імпэце крытыка параўноўвала яго з Ўінслава Гомэрам. З 1913 да 1942-га выкладаў у сярэдніх школах і каледжах у Нью-Ёрку, доўгія гады быў звязаны з Вышэйшаю школаю Таўнзэнда Гэрыса Каледжу Нью-Ёрку. У 1942-м пераехаў у Данбартан у штаце Нью-Гэмпшыр.

У 1957 годзе працы мастака экспанаваліся ў Мастацкім музеі Фарнсўарта ў Роклэндзе штату Мэн, у 1961-м – у Каледжы Нью-Ёрку. У 1997–2000 тры выставы прайшлі ў галерэі “Spanierman” у Нью-Ёрку Працы Абрама Багданава захоўваюцца ў розных музеях і галерэях ЗША ды Еўропы. А звесткі пра сям’ю мастака ёсць у архівах Беларусі.

Імя Абрама Багданава, амерыканскага мастака беларускага паходжання, вартае пільнае ўвагі і беларускіх навукоўцаў.